## БЯЗВІЗАВЫ ТРАНЗІТ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, які ўстанаўлівае для грамадзян Кітайскай Народнай Рэспублікі бязвізавы парадак уезду і выезду, а таксама транзітнага праезду (транзіту) праз тэрыторыю Беларусі і часовага знаходжання ў краіне на тэрмін да трох сутак. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Такі парадак прадугледжаны для грамадзян КНР, якія прыбываюць прамымі авіярэйсамі з аэрапортаў краіны грамадзянскай прыналежнасці, пры наяўнасці ў дзейным дакуменце для выезду за мяжу дзеючай візы дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза або дзяржаў — удзельніц Шэнгенскай зоны.

## ПЛЮС НОВЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ

Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, які прадугледжвае стварэнне буйнога мультымадальнага прамыслова-лагістычнага цэнтра ў пасёлку Балбасава Віцебскай вобласці.

Гэты комплекс стане буйным парталам для размяшчэння вытворчасцяў па апрацоўцы сыравіны, перавалцы грузаў, каардынацыі ўзаемадзеяння розных відаў транспарту, кароткатэрміновага і доўгатэрміновага захоўвання тавараў.

Нормы дакумента накіраваны на развіццё лагістычнай сістэмы краіны, павышэнне яе транзітнай прывабнасці. Рэалізацыя ўказа дасць магчымасць павялічыць прыток валютных паступленняў і падатковых плацяжоў, а таксама дадаткова стварыць не менш за 400 працоўных месцаў і вырашыць праблему занятасці ў рэгіёне.

## ПРЭЗІДЭНТ НАВУЧЫЎ ДЭПАРДЗЬЕ КАСІЦЬ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з вядомым французскім акцёрам Жэрарам Дэпардзье, які прыехаў у Беларусь, каб асабіста пазнаёміцца з нашай краінай і вядзеннем у ёй сельскай гаспадаркі.

Аляксандр Лукашэнка і Жэрар Дэпардзье ў нефармальнай абстаноўцы пагутарылі на тэмы падтрымкі сельскай гаспадаркі ў сучасным свеце, развіцця тэхналогій па вырошчванні экалагічна чыстых прадуктаў харчавання. Былі таксама закрануты магчымыя перспектыўныя праекты супрацоўніцтва Беларусі і Францыі ў галіне культуры і мастацтва.

Кіраўнік дзяржавы правёў для Жэрара Дэпардзье кароткую экскурсію па тэрыторыі афіцыйнай рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Азёры» ў Астрашыцкім Гарадку, азнаёміў з некаторымі ўзорамі айчыннай сельскагаспадарчай тэхнікі, навучыў навыкам ручной касьбы, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

■ Прафсаюзны рух

# ПРАБЛЕМЫ РАЗМЕРКАВАННЯ І ЗАМЕЖНАЙ АДУКАЦЫІ

## цікавяць моладзь з розных краін

**Магчымасць абмеркаваць іх мелі ўдзельнікі міжнароднага маладзёжнага прафсаюзнага адукацыйнага форуму «Тэмп—2015». Студэнты і рабочыя не толькі нашай краіны, але і яшчэ сямі дзяржаў, сярод якіх Расія, Малдова, Кіпр і іншыя, змаглі задаць намесніку кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігару БУЗОЎСКАМУ найбольш актуальныя для іх пытанні.**

Так, студэнтка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Варвара Бабашка пацікавілася, ці чакаюцца змены ў сістэме размеркавання, якога так баяцца многія навучэнцы. «Размеркаванне, як правіла, не падабаецца тым, каго адпраўляюць у рэгіёны, — адзначыў Ігар Бузоўскі. — Таму трэба добра вучыцца, каб мець магчымасць выбіраць месца адпрацоўкі. Сістэму часам крытыкуюць, але ж размеркаванне — гэта гарантыя, што малады спецыяліст будзе ўладкаваны адразу пасля заканчэння ВНУ ці каледжа. У Еўропе сёння знайсці працу няпроста. Ёсць яшчэ і паняцце дзяржзаказу. Людзі, якія плацяць падаткі, маюць права на бясплатную медыцыну, адукацыю, дзе патрэбны прафесіяналы. І з бюджэту выдаткоўваюць грошы на падрыхтоўку гэтых спецыялістаў. Не хочаш размяркоўвацца — заплаці за сваё навучанне і выбірай любое месца працы».

Моладзь з Малдовы хацела даведацца, як у Беларусі наладжана супрацоўніцтва паміж прафсаюзамі і ўрадам у галіне заканатворчасці і ці можа аб'яднанне паўплываць на прыняцце таго ці іншага дакумента. **Старшыня ФПБ Міхаіл ОРДА**, які таксама прысутнічаў на сустрэчы, узгадаў, што ў нас дзейнічае Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаннях. Гэты савет дапамагае ўраду, наймальнікам і прафесійным аб'яднанням знаходзіць кампрамісы пры разглядзе спрэчных момантаў. «Мы дамагліся таго, што цяпер урад, калі вырашае праблемы, што тычацца сацыяльнай сферы, абавязкова ўзгадняе свае дзеянні з Федэрацыяй прафсаюзаў», — паведаміў Міхаіл Орда. Ігар Бузоўскі дадаў, што без прафсаюзаў наладзіць камунікацыю паміж калектывамі і кіраўніцтвам дзяржавы было б нашмат складаней: «Можна выходзіць на вуліцу з транспарантамі і такім чынам адстойваць правы, аднак эфектыўней, калі рашэнне прымаецца праз дагавор».



Фота БЕЛТА.

У цэнтры ўвагі аказаліся таксама адукацыйныя магчымасці. Прадстаўнік Федэрацыі прафсаюзаў Рэспублікі Казахстан Руслан Карташоў спытаў аб праграмах па абменах студэнтамі паміж Казахстанам і Беларуссю. Ігар Бузоўскі паведаміў, што такія праграмы ёсць, але пакуль гэта асобныя пагадненні на ўзроўні пэўных ведамстваў. Абмен студэнтамі патрабуе значных фінансавых выдаткаў, таму ці будзе супрацоўніцтва ў галіне адукацыі развівацца, залежыць ад яго эфектыўнасці. Гэта не турыстычныя паездкі за дзяржаўныя грошы: удзельнічаць у падобных праграмах павінны найлепшыя студэнты, якія змогуць потым на працы прымяніць замежны вопыт.

Па-ранейшаму грамадства хвалююць жыллёвыя пытанні. «Несправядліва, што, калі ты атрымліваеш арэндную кватэру, цябе здымаюць з чаргі. Гэтае ж жыллё не прыватызуецца», — выказала незадаволенасць сваіх маладых калег старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў хімічнай, горнай і нафтавай галін прамысловасці Святлана Клачок. Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта запэўніў, што гэту праблему абмяркоўваюць на ўзроўні ўрада і ў найбліжэйшы час будзе прынята рашэнне.

Вынікамі сустрэчы Ігар Бузоўскі застаўся задаволены:

— Я бачу, што моладзь сочыць за сітуацыяй у краіне і не адарвана ад праблем, якія ёсць у грамадстве. Спадзяюся, што прафсаюзны рух будзе папаўняцца маладзёжным актывам. Сёння для развіцця дзяржаў на постсавецкай прасторы патрэбны інавацыйныя метады працы. Прарыўныя ідэі цяперашніх студэнтаў і выпускнікоў будуць карысныя і асобным прадпрыемствам, і краіне ў цэлым.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

## ЗАНЯТАСЦЬ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

### разам з экспартам і інвестыцыямі

**Пра гэта на пасяджэнні Баранавіцкага райвыканкама казаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

«Прыярытэтнымі ў эканамічнай палітыцы нашай краіны сёння з'яўляюцца, на мой погляд, тры важныя пытанні — экспарт, занятасць і інвестыцыі. Калі раней пытанні занятасці былі недзе ў цені, то цяпер яны выходзяць на паверхню. І яны павінны быць на парадку для ўсіх кіраўнікоў — і раённых, і абласных, і кіраўнікоў прадпрыемстваў», — падкрэсліў ён.

У час пасяджэння быў разгледжаны шэраг пытанняў, у прыватнасці, вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Баранавіцкага раёна за I паўгоддзе 2015 года. Гаворачы аб занятасці насельніцтва, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што Баранавіцкі раён стварае недастатковую колькасць новых працоўных месцаў.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыў, што раён мае пэўныя поспехі, у першую чаргу — у сельскай гаспадарцы. Міхаіл Мясніковіч растлумачыў, што прыняты шэраг рашэнняў у гэтай сферы, напрыклад, забарона авансавання гаспадаркам пад будучае малако. «Вядома, будуць нейкія пэўныя выключэнні, але яны павінны прымацца рашэннем выканкама. У Баранавіцкім раёне некаторыя гаспадаркі ўжо маюць авансы на 9 месяцаў наперад», — паведаміў Міхаіл Мясніковіч.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама ўзяў удзел у нарадзе па працы праблемных прадпрыемстваў Брэсцкай вобласці. Паводле яго слоў, ужо выпрацаваны шэраг прапаноў як арганізацыйнага, так і фінансавага характару адносна праблемных прадпрыемстваў. «Ім трэба сур'ёзна займацца таксама пытаннямі мадэрнізацыі, падкрэсліваю, рэальнай мадэрнізацыі. На прадпрыемствах павінны разумець, які вынік будзе пасля мадэрнізацыі і наколькі паспяхова будзе прадавацца прадукцыя на рынках блізкага і далёкага замежжа», — растлумачыў Міхаіл Мясніковіч.

Яшчэ адным важным пытаннем стане абнаўленне схемы рэгіянальнага супрацоўніцтва. «Мы павінны зрабіць гэтую схему больш эфектыўнай і актывізаваць працу з рэгіёнамі Расіі, Кітая, Украіны, шэрагу іншых буйных дзяржаў», — канстатаваў ён.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

■ Выбары-2015

# Семінары для ўдзельнікаў кампаніі

**Учора ў краіне завяршылася фарміраванне тэрытарыяльных камісій па выбарах Прэзідэнта (усяго іх утворана 153). Пачынаецца навучанне ўдзельнікаў выбарчай кампаніі. Неабходнасць правядзення падобнай вучобы патлумачыў учора ў Гродне сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай ЛАЗАВІК.**




«Кожная выбарчая камісія павінна быць гатова кампетэнтна працаваць з выбаршчыкамі, — заявіў ён. — Нягледзячы на тое, што ў склад камісій уваходзіць нямала грамадзян, якія ўжо маюць вопыт удзелу ў такіх кампаніях, усё ж людзям патрэбна адпаведная падрыхтоўка. З гэтай мэтай у першую чаргу ў рэгіёнах праводзяцца семінары для прадстаўнікоў тэрытарыяльных камісій, якія працуюць перш за ўсё з кандыдатамі, дакументамі. Наступным этапам стане навучанне ў раёнах прадстаўнікоў участковых камісій».

Мікалай Лазавік надаў важнае значэнне гэтаму этапу, бо ўчастковыя камісіі працуюць непасрэдна з выбаршчыкамі і сутыкаюцца на ўчастках з самымі рознымі сітуацыямі. «Людзі павінны ведаць, як рэагаваць, што рабіць у той ці іншай, самай непрадбачанай, сітуацыі», — падкрэсліў сакратар ЦВК.

Цэнтрвыбаркам рэкамендуе праводзіць навучанне ў раёнах інтэрактыўнымі метадамі, распрацаваны адпаведныя рэкамендацыі. Такія навучальныя семінары таксама мабілізуюць — яны з'яўляюцца своеасаблівым стартам для асноўнай работы камісій, заўважыў Мікалай Лазавік.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў падкрэсліў, што ў гэтай выбарчай кампаніі ёсць шмат наваўвядзенняў, якія неабходна данесці і растлумачыць для ўсіх, хто ў ёй задзейнічаны. Ён запэўніў, што ў Гродзенскай вобласці будуць прыняты ўсе неабходныя захады для правядзення выбараў на высокім арганізацыйным узроўні.

Сёння пачынаецца збор подпісаў па вылучэнні кандытатаў у Прэзідэнты, які прадоўжыцца да 21 жніўня.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

# ВЯРНУЦЬ ЯК МІНІМУМ ТОЕ, ШТО ЎКЛАДЗЕНА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

**Начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ** патлумачыў, што асноўная задача новай пастановы — збалансаваць ацэнку ўзносаў грамадзян падчас будаўніцтва жылля і тых сум, якія ім выплачваюць, калі яны выходзяць з адпаведнага праекта. Менавіта для гэтага і ўведзены новы каэфіцыент індэксацыі. Нагадаю, што раней пры такім вяртанні грошай існавала прывязка да індэкса будаўніча-мантажных работ. Аднак ужо летась гэты індэкс пачалі лічыць па іншай методыцы, і часта ён быў меншы за 1. У гэтым выпадку атрымлівалася, што, калі чалавек умоўна ўносіў у будаўніцтва 100 млн рублёў, то пры выхадзе з яго гэтая сума множылася на памяншальны індэкс. Напрыклад, калі індэкс быў 0,9, то кліент атрымліваў толькі 90 млн рублёў. А гэта не зусім зразумела, бо мінулы алгарытм кампенсацыі ўвогуле не ўлічваў інфляцыю, удакладняючы сваю пазіцыю спецыялісты Мінбудархітэктуры.

У пастанове таксама гаворыцца, што цяпер пры разліку сумы, якая будзе вяртацца былому дольшчыку, усе плацяжы дзеляцца па крыніцах фінансавання ў вызначаным парадку. Пералік унесеных сум вядзецца па кожнай крыніцы фінансавання асобна з улікам даты паступлення грашовых сродкаў на спецыяльны бягучы рахунак забудоўшчыка.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*